ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 САКАВІКА 2017 г. ЧАЦВЕР № 55 (28419)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**«Псеўданім даў мне сілы»**



**Сямейны патруль правапарадку**



**Тайна «сёмага гульца»**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Калі гаварыць аб рэалізацыі на месцах Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрымакства», хачу звярнуць увагу на неабходнасць персаніфікаванага падыходу. Галоўнае, тут павінен быць персаніфікаваны ўлік тых людзей, якія ў сілу розных абставін не працуюць ці не хочуць працаваць, або працуюць, але, што называецца, знаходзяцца ў ценявым сектары эканомікі. У кожным сельсавеце, у кожным раёне, кожнай вёсцы добра ведаюць гэтых людзей. І трэба не проста шырокім нейкім невадам закідваць, як часам бывае, а працаваць персаніфікавана. І дэпутацкі корпус у гэтым павінен праяўляць дастатковую актыўнасць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8854 | ▲ |
| Еўра | 2,0339 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0699 | ■ |


ISSN 1990 - 763X


# ХАЙ ШЛЯХ БУДЗЕ ДОБРЫМ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работнікі ўнітарнага прадпрыемства «Мінскзеляндбуд» рамантуюць сталічныя вуліцы.

■ Акцэнты

## «ПАДУШКА БЯСПЕКІ» ДЛЯ САІСКАЛЬНІКАЎ

### У краіне няма раёнаў, дзе адсутнічаюць вакансіі

**Страхаванне ад беспрацоўя ўвядуць у 2018 годзе. Які будзе памер страхавой дапамогі? Хто зможа на яе прэтэндаваць? Ці ёсць абмежаванні па колькасці беспрацоўных, якія могуць стаяць на ўліку? І колькі рэальна зарабіць на грамадскіх работах? Сітуацыю растлумачыў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ.**

### Памер дапамогі — 60 працэнтаў заробку



Праект па ўвядзенні сістэмы страхавання ад беспрацоўя міжведамасная група, створаная па даручэнні ўрада, рыхтавала з лістапада 2016 года па студзень 2017-га. У лютым прапановы накіравалі ў Савет Міністраў. Канкрэтнага рашэння пакуль няма. Плануецца, што будзе ўстаноўлены асобны страхавы тарыф, усе работнікі будуць удзельнічаць у фарміраванні страхавога фонду абавязкова і на роўных умовах з наймальнікамі. Па папярэдняй інфармацыі, штомесячны ўзнос складзе 0,5 працэнта ад фонду аплаты працы. Атрымліваць дапамогу змогуць толькі тыя, хто стаіць на ўліку ў службе занятасці, страціў работу з уважлівых прычын і мае не менш за год страхавога стажу. Сярэдні памер страхавых выплат за беспрацоўі — 60 працэнтаў ад сярэдняга заробку грамадзяніна. Перыяд выплат — 26 каляндарных тыдняў, ці паўгода (першыя 13 тыдняў дапамога будзе складаць 70 працэнтаў заробку, наступныя 13 тыдняў — 50 працэнтаў).


СТАР. 2


■ Камунальныя стасункі

## ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ЭКАНОМІЯ

### Цяпло ў батарэях з лічыльнікамі абыходзіцца танней

**Камунальнікі адзначаюць, што, нягледзячы на пастаянны прырост жыллёвага фонду за кошт будаўніцтва, выдаткі на яго ўтрыманне ў зімовы перыяд пастаянна зніжаюцца. Напрыклад, калі ў 2010 годзе на ацяпленне жылля было накіравана больш за 23,4 млн гігакалорый, то ў 2015 годзе гэта лічба склала каля 22 млн гігакалорый. І спецыялісты адзначаюць, што справа тут не ў глабальным пацяпленні.**

### Не губляць тэмпературу па дарозе

**Намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Міхаіл МАЛАШАНКА** расказаў, што сёння працягваецца мадэрнізацыя цеплавых трас і сістэм цеплазабеспячэння. Штогод папярэднеізаляванымі трубамі (ПІ-трубамі), якія значна скарачаюць страты цяпла пры транспарціроўцы, пракладваецца ад 750 да 840 кіламетраў трубаправодаў. Цяпер у цэлым у сістэме ЖКГ цеплавыя трасы складаюцца на 52,6% менавіта з гэтых ПІ-труб. А вынікам мадэрнізацыі стала істотнае памяншэнне тэхналагічных страт на рух цеплавой энергіі ў сетках: у 2011 годзе яны складалі 19,4%, летась — ужо толькі 12%.

Штогод пэўная колькасць старых жылых дамоў падпадае пад цеплавую рэабілітацыю. Паводле слоў спецыяліста, спажыванне цеплаэнергіі на душу насельніцтва ў 2016 годзе было 2,3 Гкал, у 2010 годзе — 2,5 Гкал. «Гэтыя вынікі дасягнуты як сістэмай ЖКГ, так і пры дапамозе самога насельніцтва, таму што яно пачало эканоміць», — сказаў Міхаіл Малашанка.

Працягваецца работа па замяшчэнні прыроднага газу і выкарыстанні мясцовых відаў паліва. Сёння каля 76% энергакрыніц у сістэме ЖКГ выкарыстоўваюць драўнянае і тарфяное паліва. Больш таго, у балансе кацельна-пячнога паліва ў Віцебскай вобласці доля мясцовых відаў наблізілася да 68%, у Магілёўскай вобласці — да 52%. Праводзяцца іншыя агульнарэспубліканскія мерапрыемствы. Усё гэта добра, але для больш сур'ёзнага эфекту цяпло трэба эканоміць у кожнай кватэры.

А вось тут ёсць праблемы...


СТАР. 4



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Актуальна

# ГАЛОЎНЫ ФАКТАР

## Чаму важна захаваць стабільнасць

**Падчас нядаўняй рабочай паездкі ў Магілёўскую вобласць кіраўнік дзяржавы заявіў: сітуацыя ў краіне кантралюецца. Гэта добра як у плане бяспекі і стабільнасці ў грамадстве, так і для інвестыцыйнага клімату. Сапраўды, калі б у дзяржаве было неспакойна, замежны бізнес пабаяўся б укладваць у праекты на тэрыторыі Беларусі грошы. «Звязда» пацікавілася ў экспертаў, чаму сёння пытанні бяспекі і міру ў краіне маюць такі прыярытэт.**

**Рыгор БЫСЮК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, дырэктар дзяржаўнай установы «Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой»:**

— Пазіцыю кіраўніка дзяржавы ў пытаннях бяспекі падтрымлівае большасць добрасумленных грамадзян. У размовах з жыхарамі Брэста і, у прыватнасці, з супрацоўнікамі мемарыяльнага комплексу ніхто не выказваў прынцыпова супрацьлеглую пазіцыю. Наш народ жадае жыць у спакоі і міры. І гэта таксама падтрымліваецца надзейным кантролем на мяжы. Абсалютная большасць хоча працаваць спакойна. Невялікая частка насельніцтва была незадаволеная рэалізацыяй Дэкрэта № 3, і ў такой сітуацыі Прэзідэнт прыняў рашэнне прыпыніць спагнанне платы. Правакатары, хоць адзін з тысячы, ёсць і будуць заўсёды. Але дзяржава павінна абараняць сваіх людзей.

**Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па эканамічнай палітыцы:**

— Беларусь з'яўляецца краінай, прывабнай для замежных інвестараў — асабліва з пункту гледжання палітычнай стабільнасці, бяспекі, празрыстасці і зразумеласці інвестыцыйнага заканадаўства. У нас вельмі нізкія паказчыкі па карупцыі, гэта таксама становіцца ўплывае на прынясце інвестарамі рашэння па рэалізацыі праектаў у Беларусі. Больш за тое, ва ўрада ёсць цэлы план па паляпшэнні інвестыцыйнага клімату, мы павінны ўвайсці ў дваццатку краін з найлепшымі ўмовамі вядзення бізнесу.

Адным з найважнейшых прыярытэтаў у рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады з'яўляецца прыцягненне інвестыцый. Для дасягнення гэтага прыярытэту дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у 2017 годзе будуць унесцыя змяненні і дапаўненні ў заканадаўства аб інвестыцыях і прыватызацыі, мэта якіх — палепшыць інвестыцыйны клімат.

**Таццяна КАНАНЧУК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы:**

— Нацыянальная бяспека — самы галоўны фактар, без уліку якога нельга разглядаць іншыя: ні эканамічнае развіццё, ні сацыяльнае. Было ўжо шмат выказванняў, што тыя ж самыя мітынгі «недармаедаў» выкарыстаны зацікаўленымі людзьмі. Але, мяркую, унутранаму спакою ў краіне гэты момант не пагражае.

Тут вельмі правільныя вывады трэба рабіць. Перш за ўсё, тое, што зараз робіцца ў краіне, — стварэнне новых працоўных месцаў, забеспячэнне людзей занятасцю, стварэнне ўмоў, — робіцца для таго, каб усе людзі працавалі і атрымлівалі зарплату. Каб не было вымушаных адпачынкаў, чатырохдзёнак, трохдзёнак, каб былі аб'ёмы работы. Гэта для людзей сёння самае галоўнае.

Зараз над гэтым павінны працаваць усе галіны ўлады. У такім выпадку менш людзей будуць схільныя да тых негатыўных момантаў і заклікаў, якія гучаць. Тыя, хто заклікае да ўсіх гэтых мітынгаў, — дакладна не пераживаюць за краіну, а наадварот, схопліваюць кожны момант, які можна скарыстаць менавіта для негатыву ў грамадстве, для ўцягвання ў канфлікт людзей. Гэта зусім няправільны метад і падыход, і сёння ў краіне дастаткова сіл, каб у цывілізаваных рамках не дапусціць унутранай напружанасці.

**Вадзім БАРАВІК, старшыня назіральнага савета Рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый»:**

— У нас асобныя палітычныя сілы і дэструктыўныя групоўкі спрабуюць выкарыстоўваць пэўныя сацыяльныя і эканамічныя цяжкасці, якія ў краіне сёння ёсць, каб дэстабілізаваць сітуацыю. Мы ведаем, што эканамічная складанасці абумоўлены знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай сітуацыяй: Расія пад санкцыямі, Украіна перажывае канфлікт, ёсць праблемы ў ЕС, рынкі звузіліся. Як бачым, крызіс носіць рэгіянальны характар. І некаторыя спекулююць на гэтых момантах, аднак улада не дапусціць дэстабілізацыі па шэрагу прычын. Па-першае, у нас няма разрыву паміж рознымі катэгорыямі грамадзян, напрыклад багатымі і беднымі. Па-другое, улада не адарвалася ад народа. У цэнтры ўвагі ў нас чалавек, таму дзяржаўныя структуры робяць усё для яго дабрабыту. Акрамя таго, у нас добра працуюць сілавыя структуры. І галоўнае — у грамадстве ёсць разуменне таго, што любыя рэвалюцыі адкідваюць народ на дзясяткі гадоў назад. Беларускае грамадства гэтага не хоча. Наш шлях — эвалюцыя, а не рэвалюцыя

■

# «ПАДУШКА БЯСПЕКІ» ДЛЯ САІСКАЛЬНІКАЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Страхаванне ад беспрацоўя займае цэнтральнае месца ў сістэме сацыяльных амартызатараў, — адзначыў Андрэй Лабовіч падчас анлайн-канферэнцыі, якая праводзілася на сайтах БЕЛТА і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. — Гэта форма сацыяльнай абароны эканамічна актыўнага насельніцтва ад рызыкі, звязанай са стратай работы па незалежных ад чалавека абставінах.

Падтрымка людзей, што засталіся без працоўнага месца з аб'ектыўных прычын, шырока распаўсюджана ў свеце. Разам з тым ніводная сістэма страхавання, як бы добра яна ні была прадумана, не ў стане вырашыць праблему беспрацоўя ў цэлым. Мэта такой страхоўкі — забяспечыць часовае і частковае замяшчэнне даходу грамадзяніна, які страціў работу, у перыяд пошуку новага месца.

Андрэй Лабовіч дадаў, што на першым этапе, да запуску сістэмы страхавання ад беспрацоўя, прапануецца павысіць дапамогу па беспрацоўі. Звольненым у сувязі са скарачэннем колькасці ці штату работнікаў павялічаць выплаты да 100 працэнтаў бюджэту пражыточнага мінімуму (180 рублёў), іншым звольненым з уважлівых прычын — да 50 працэнтаў БПМ.

## Збалансаваць попыт і прапанову

Першы намеснік міністра таксама паведаміў, што з 2019 года ў краіне пачне ўкараняцца новая мадэль прагназавання патрэбы эканомікі ў кадрах. Яе актуальнасць абумоўлена сітуацыяй на біржы, якая характарызуецца дысбалансам попыту і прапановы па прафесіях. Для вырашэння гэтай праблемы ў канцы 2015 года намеснік прэм'ер-міністра зацвердзіў план работы па бягучым планаванні падрыхтоўкі кадраў і ўдасканаленні сярэдне- і доўгатэрміновага прагназавання патрэбы ў спецыялістах. З улікам міжнароднага вопыту летась была сфарміравана мадэль, якая ўключае ў сябе тры модулі («эканоміка», «рынак працы» і «прафесійная адукацыя»), падрыхтавана метадалагічная база.

## Грамадскія работы як выйсце

Ніякіх лімітаў па пастаноўцы на ўлік у службе занятасці няма. Андрэй Лабовіч запэўніў, што звярнуцца па рэгістрацыю можа любы беспрацоўны грамадзянін, які шукае работу і гатовы прыступіць да яе.

У краіне няма раёнаў, дзе адсутнічаюць вакансіі. Разам з тым найбольшы ўзровень афіцыйнага беспрацоўя зафіксаваны ў Крычаўскім раёне Магілёўскай вобласці — 1,6 працэнта. У Маларыцкім, Лідскім, Мастоўскім і Капыльскім раёнах гэты паказчык дасягае 1,5 працэнта. А самы нізкі ўзровень беспрацоўя — у Мінскім раёне (0,2 працэнта).

Што да даручэння Прэзідэнта ўладкаваць усіх незанятых грамадзян да 1 мая, то перш намеснік міністра заўважае, што гэта датычыцца не толькі службаў занятасці, але і ўсёй вертыкалі ўлады, дэпутатаў.

— Усе, хто хоча і можа працаваць, атрымаюць дапамогу ад мясцовых органаў улады — размова ідзе аб прапановах пастаяннай і часовай работы. Таксама ахвотным будзе забяспечаны ўдзел у аплачваемых грамадскіх работах, — пракаментаваў Андрэй Лабовіч.

Арганізацыя грамадскіх работ ускладаецца на мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Людзям могуць прапанаваць заняцца азеляненнем тэрыторый, зборам і перапрацоўкай другаснай сыравіны, дагляда́ць месцы пахавання, дапамагаць у аказанні сацыяльных паслуг, папрацаваць на будоўлі ці ў сельскай гаспадарцы. У якасці грамадскіх работ могуць выкарыстоўвацца вакансіі, якія не запаўняюцца больш, чым тры месяцы, а таксама іншая дзейнасць, якая мае сацыяльна карысную значнасць.

Памер аплаты на такіх работах залежыць ад наймальніка. У сярэднім у дзень можна зарабіць 10—12 рублёў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

❍ У ТЭМУ

## На аднаго зарэгістраванага беспрацоўнага ў Мінску прыпадае 1,3 вакансіі

**Аб гэтым паведаміла намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, начальнік упраўлення занятасці насельніцтва Мінгарвыканкама Таццяна КУДЗЕВІЧ.**

На цяперашні момант патрэба наймальнікаў горада ў кадрах складае больш за восем тысяч чалавек, што на 37% вышэй, чым у аналагічны перыяд мінулага года. Удзельная вага вакансій для рабочых спецыяльнасцяў складае каля 46%. Самыя запатрабаваныя сярод іх — арматуршчык, бетоншчык, муляр, тынкоўшчык, кантралёр-касір, швачка, кухар. Што датычыцца кваліфікаваных спецыялістаў, то больш за ўсё запытаў паступае на ўрачоў, медыцынскіх сясцёр, інжынераў-праграмістаў, выхавальнікаў, апошнім часам узнікла патрэба ў перакладчыках, прапановы па якіх яшчэ некалькі гадоў таму былі адзінкавыя. Цяпер жа на рынку працы лішак кіроўцаў, слесараў, сталяроў, маляроў. Высокая канкурэнцыя сярод прэтэндэнтаў на некваліфікаваную працу: грузчыкаў, дворнікаў, вартаўнікоў, вахцёраў.

Сярод прадстаўленых вакансій не рэдкасць высокія аклады: напрыклад, цесляру-бетоншчыку прапануюць суму ў 1700 рублёў, архітэктару — 2500 рублёў, дырэктару — ад 1500 рублёў і вышэй. Самы высокі з прапануемых на рынку працы заробак у камандзіра паветранага судна — 6000 рублёў. Сярэдняя ж па ўсіх вакансіях сума аплаты складае каля 500 рублёў.

Летась на наваствораныя месцы ў сталіцы было працаўладкавана 31 200 чалавек, у студзені гэтага года — ужо 583 чалавекі. Цяпер на біржы стаіць каля шасці тысяч мінчан. Заахвочваецца самазанятасць насельніцтва. Тым, хто прадстаўляе дзейсны бізнес-план, даюцца субсідыі ў памеры каля дзвюх тысяч рублёў, за апошнія два з паловай месяцы фінансавая дапамога была выдзелена 27 беспрацоўным, большасць з якіх сталі індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

Працягваецца арганізацыя прафільнага навучання па больш чым 30 запатрабаваных на рынку спецыяльнасцях. Тыя, хто скончыў курсы, будуць задзейнічаны ў будаўніцтве метро, азеляненні горада, рабоце грамадскага транспарту і іншых сферах. Зараз плануецца набраць групу для навучання рабоце дзяжурных на атракцыёнах. Акрамя таго, забяспечана магчымасць арганізацыі часовага працаўладкавання на падсобныя работы, сярэдні заробак у дзень — 12—15 рублёў. Дагаворы заключаны з 74 прадпрыемствамі і арганізацыямі. Не засталася па-за ўвагай моладзь, для якой пытанне часовай занятасці становіцца асабліва актуальным у летні перыяд. У юнакоў і дзяўчат будзе магчымасць папрацаваць на 184 аб'ектах сталіцы, сярод якіх большую частку складаюць навучальныя ўстановы, аднак у спісе ёсць і вельмі прыцягальныя для школьнікаў і студэнтаў заапарк і прадпрыемства «Мінскзеленбуд».

З 27 сакавіка на базе тэрытарыяльных цэнтраў занятасці будуць дзейнічаць кансультацыйныя пункты, дзе кожны зможа атрымаць адказы на пытанні аб працаўладкаванні, якія яго хваляюць, а таксама псіхалагічную падтрымку і рэкамендацыі, як правільна скласці рэзюмэ і прадставіць сябе на гутарцы з работадаўцам.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# ЦІ ЎСЁ Ў ПАРАДКУ НА ЗЯМЛІ?

**Як адзначыў падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ, летась выкананы мерапрыемствы рэспубліканскага і рэгіянальных планаў па навядзенні парадку на зямлі, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

«Разам з тым ва ўсіх рэгіёнах выяўлены факты парушэнняў патрабаванняў утрымання тэрыторый населеных пунктаў, унутраных кар'ераў, месцаў пахавання адходаў, сельскагаспадарчых аб'ектаў», — адзначыў прэм'ер-міністр. Паводле яго слоў, выяўлены парушэнні ў палове з прылеглых да сельскагаспадарчых аб'ектаў тэрыторый (несанкцыянаваныя месцы размяшчэння адходаў). У большасці выпадкаў парушэнні былі ліквідаваны суб'ектамі гаспадарання.

Прэм'ер-міністр таксама звярнуў увагу, што актуальным застаецца пытанне ўтрымання і эксплуатацыі ўнутрыгаспадарчых кар'ераў, чацвёртая частка якіх не адпавядае асноўным крытэрыям навядзення парадку на зямлі. «Гэта правядзенне здабычы карысных выкапняў больш за ўстаноўленую глыбіню, а таксама несанкцыянаванае размяшчэнне адходаў у кар'ерах», — растлумачыў Андрэй Кабякоў.

Кіраўнік урада таксама адзначыў, што па-ранейшаму адным з праблемных пытанняў з'яўляецца падтрыманне ў належным стане і добраўпарадкаванне тэрыторый садовых таварыстваў і спажывецкіх кааператываў

■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Сумарны капітал найбагацейшых людзей планеты вырас да $7,67 трлн

Пры гэтым першае месца ў агульнасусветным рэйтынгу мільярдэраў, які штогод публікуецца часопісам Forbes, чацвёрты раз запар дасталася заснавальніку Microsoft Білу Гейтсу. Яго капітал за год вырас з 75 млрд да 86 млрд долараў. Актывы кіраўніка Berkshire Hathaway Уорэна Бафета павялічыліся на $14,8 млрд, што забяспечыла яму другое месца. Заснавальнік Amazon Джэф Безас перамясціўся з пятага месца на трэцяе, яго капітал ацэньваецца ў $ 72,8 млрд.

## Зямлі прадраклі сутыкненне з Марсам

Такую версію агучыў геафізік Стывен Меерс з Вісконсінскага універсітэта ў Мадысане. Пра гэта паведамляе Scientific American.



Меерс і яго калегі прыйшлі да высновы, што Сонечная сістэма з'яўляецца хаатычнай. Навукоўцам было вядома, што апошнія 50 мільёнаў гадоў арбіта Зямлі трохі мяняла сваю форму з перыядычнасцю 2,4 мільёна гадоў. Прыкладна з такой жа рэгулярнасцю адзначаліся і змены клімату. Было вызначана, што ў наступныя мільярды гадоў Зямля і Марс, калі яны да гэтага яшчэ не будуць знішчаны Сонцам, могуць сутыкнуцца. Навукоўцы між тым адзначаюць, што імавернасць катастрофы надзвычай малая.

## ЗША вызначаць спіс прылад, якія будзе дазволена правозіць на бартах самалётаў

Раней ЗША абвясцілі аб намеры ўвесці забарону на правоз электронных прылад на бартах самалётаў, якія ляцяць у Злучаныя Штаты з васьмі краін Паўночнай Афрыкі і Блізкага Усходу. Сярод іх — Егіпет, Іарданія, Кувейт, Марока, Катар, Саудаўская Аравія, Турцыя і ААЭ. Забарона будзе ўведзена на нявызначаны тэрмін. Амерыканская забарона на электроніку на борце звязана з тэрарыстычнай пагрозай. Брытанія ўслед за ЗША збіраецца забараніць правоз мабільнай электронікі ў самалётах. Гэта датычыцца рэйсаў з шасці краін: Турцыі, Лівана, Іарданіі, Егіпта, Туніса і Саудаўскай Аравіі.

■ Спажывец

Да бытавога абслугоўвання на вёсцы прыцягнуць прыватны бізнес

# ХТО ПАЧЫСЦІЦЬ ВЯСКОЎЦУ КОМІН?

**Без спецыялістаў службы быту не абысціся сёння ні ў горадзе, ні ў вёсцы. Лідарамі галіны бытавога абслугоўвання насельніцтва ў Беларусі з'яўляюцца цырульні, за імі ідуць будаўнічыя арганізацыі і станцыі тэхабслугоўвання. Таксама апошнім часам актыўна развіваюцца паслугі па пашыве і рамонце швейных вырабаў. Пра гэта расказала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі гандлю і паслуг Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Валянціна ЛЯЎКОЎСКАЯ.**

Разам з тым спецыяліст адзначае нераўнамернасць прадастаўлення бытавых паслуг па краіне. Так, паводле яе слоў, праблем з іх атрыманнем у гарадах няма, чаго нельга сказаць пра сельскую мясцовасць. Гэта звязана з тым, што практычна ўсе паслугі ў бытавым абслугоўванні вяскоўцаў стратныя: сельскае насельніцтва скарачаецца, даходы ў вёсцы ніжэйшыя, чым у горадзе. Таму ўтрыманне комплексна-прыёмных пунктаў, якіх усяго па краіне налічваецца 1155, з'яўляецца затратным.

Разам з тым цяпер актыўна развіваецца выязное абслугоўванне вяскоўцаў. Пры гэтым улічваецца попыт на паслугі. Так, найбольшым попытам на вёсцы карыстаюцца паслугі па кашэнні травы, колцы дроў, узворванні ўчасткаў, рамонце печаў і чыстцы комінаў і інш. Важнай задачай спецыялісты называюць прыцягненне да аказання бытавых паслуг на вёсцы прыватнага бізнесу. Для гэтага вядзецца работа па спрашчэнні працэдуры адкрыцця бізнесу і яго вядзення. І колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў у гэтай сферы з кожным годам павялічваецца, адзначае Валянціна Ляўкоўская.

У сельскіх населеных пунктах бытавыя паслугі аказваюць 12% суб'ектаў ад зарэгістраваных у рэестры бытавых паслуг, або звыш 3,6 тысячы суб'ектаў гаспадарання больш чым у 3,7 тысячы аб'ектаў. Пры гэтым пераважаюць ІП, колькасць якіх дасягае 67% і якімі ў асноўным аказваецца адзін-два віды паслуг.

«Мы плануем, што многія віды бытавых паслуг будуць аказвацца фізічнымі асобамі, — заявіла Валянціна Ляўкоўская. — Для гэтага ім будуць дадзены прэферэнцыі. У прыватнасці, плануецца бязвыплатна перадаваць фізічным асобам будынкі комплексных пунктаў абслугоўвання, прычым усе яны знаходзяцца ў добрым стане».

У цэлым за мінулы год у краіне адкрыта каля 6 тысяч новых аб'ектаў бытавога абслугоўвання. З іх у сельскай мясцовасці — больш за 2 тысячы аб'ектаў. Створана больш за 4,5 тысячы новых працоўных месцаў.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Дзеля памяці

# Гэта трэба жывым...

**Акцыя па добраўпарадкаванні пройдзе ў Курапатах 25 сакавіка**

**Пра гэта паведаміў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА. «Федэрацыя прафсаюзаў заклікае ўсіх неабыякавых грамадзян, арганізацыі незалежна ад палітычных прыхільнасцяў, веравызнання прыняць удзел у гэтай добрай справе», — сказаў старшыня ФПБ. Ён адзначыў, што заяўкі на ўдзел ад грамадзян і арганізацый ужо паступаюць.**

Міхаіл Орда таксама адзначыў, што плануецца аб'явіць конкурс на стварэнне мемарыяла памяці і смутку ў Курапатах, паведамляе БЕЛТА. Конкурс будзе праходзіць адкрыта. Праект мемарыяла, які стане пераможцам, павінен будзе ўвасабляць гістарычнае значэнне Курапатаў.

«Мы сёння павінны разам пераадольваць існуючыя складанасці і захоўваць памяць, — падкрэсліў Міхаіл Орда. — Нельга на памяці зарабляць сумнічныя палітычныя дывідэнды, тым больш калі гэтымі правакацыямі карыстаюцца для таго, каб разгайдаць грамадства».

На працягу дзесяцігоддзяў ФПБ сумесна з працоўнымі калектывамі, моладдзю, ветэранскімі арганізацыямі праводзіць маштабную работу па аднаўленні помнікаў і іх афармленні

■ Факт

## Інтэрнэт не толькі ў паяздах, але і на вакзалах

**Беларуская чыгунка сумесна з кампаніяй МТС прыступае да рэалізацыі маштабнага праекта па забеспячэнні бясплатнага доступу да інтэрнэту па сродках тэхналогіі Wi-Fi на 19 чыгуначных вакзалах.**

Гаворка ідзе пра Мінск, Оршу, Маладзечна, Барысаў, Баранавічы, Ліду, Гродна, Лунінец, Брэст, Пінск, Гомель, Жлобін, Калінкавічы, Магілёў, Асіповічы, Бабруйск, Крычаў, Віцебск і Полацк.

На пачатковым этапе сістэмай бесправаднога доступу да сеткі інтэрнэт (Wi-Fi) быў абсталяваны электрапоезд бізнес-класа ЭПМ InterCity, што курсіруе па маршруце Гомель — Мінск. Гэты праект рэалізаваны Беларускай чыгункай сумесна з кампаніяй velcom яшчэ ў жніўні 2016 года. Цяпер праводзіцца актыўная работа па паляпшэнні якасці паслугі, у тым ліку вядзецца прапрацоўка варыянтаў развіцця сетак перадачы даных уздоўж чыгуначнага палатна, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.

## Загубілі пятлёй мішку...

**У Лепельскім раёне вышукваюць браканьера, які ўстанавіў металічныя петлі ў лесе каля вёскі Ражно на тэрыторыі Бярэзінскага біясфернага запаведніка. У адну з іх трапіў мядзведзь...**

— Яго рэшткі знайшлі работнікі Бягомльскай міжрайінспекцыі. Забрацць жывёлу, якая загінула, нелегал, відавочна, не наважыўся, і туша мядзведзя стала здабычай драпежнікаў, — расказалі ў Дзяржінспекцыі.

Буры мядзведзь уключаны ў Чырвоную кнігу Беларусі і з'яўляецца аб'ектам СІТЕС. Нанесеная прыродзе шкода ацэньваецца ў 2400 базавых велічынь, ці 55,2 тысячы рублёў. Вырашаецца пытанне аб завядзенні крымінальнай справы, праводзяцца следчыя мерапрыемствы па ўстанаўленні датычных да незаконнага палявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Ад фантастыкі — да рэальнасці

# ШТО «ХАВАЮЦЬ» ГЕНЫ

## Чэмпіёнам і ратавальнікам трэба нарадзіцца

**Магчыма, у зусім недалёкай перспектыве маладым людзям, якія марацъ аб прафесіі ратавальніка ці, скажам, пілота авіялайнера, будуць прапаноўваць у прыёмнай камісіі навучальнай установы прайсці генетычнае тэсціраванне на... устойлівасць да стрэсу. Пакуль што абітурыенты ВНУ «сілавых ведамстваў» здаюць толькі нарматывы па фізічнай падрыхтоўцы, пад увагу бярэцца таксама стан іх здароўя, а псіхалагічная ўстойлівасць не з'яўляецца прадметам даследавання.**



Фота Надзеі БУЖАН.



**Малодшы навуковы супрацоўнік лабараторыі генетыкі чалавека Кацярына НЕСЦЯРЭНКА за работай: выдзеленая ў чалавека ДНК праходзіць 20 цыклаў і памнажаецца ў мільён разоў.**

— Між іншым, нярэдка, нягледзячы на сваю выдатную фізічную падрыхтоўку, моцныя мужчыны «ламаюцца» псіхалагічна, калі трапляюць, напрыклад, на пажар ці на месца катастрофы, дзе ім даводзіцца мець справу з фрагментамі чалавечых цел. Псіхаэмацыянальныя якасці і стрэсаўстойлівасць важныя для прадстаўнікоў многіх прафесій, а не толькі для ратавальнікаў ці вадалазаў, тым больш што прычынай большасці тэхнагенных катастроф становіцца чалавечы фактар, — разважае **кіраўнік лабараторыі генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар Ірма МАСЭ.** — І прычынай авіякатастроф таксама становіцца часцей за ўсё чалавечы фактар: памылкі допускаюць не толькі пілоты, але і авіядыспетчары. Вядома, што ад 75 да 85% характару нашай асобы вызначае спадчынная інфармацыя. Цяпер мы ў сваёй лабараторыі вывучаем генетычныя механізмы псіхаэмацыянальных асаблівасцяў чалавека. У прыватнасці, у фокусе нашай увагі — гены стрэсаўстойлівасці. Аднак ацаніць псіхаэмацыянальныя якасці чалавека, напэўна, больш складана, чым выявіць схільнасць да таго ці іншага захворвання, паколькі за стрэсаўстойлівасць адказвае шмат генаў — не менш дваццаці.

Вучоныя сабралі матэрыял для генетычнага аналізу ў 100 прадстаўнікоў спецназа і параўноўваюць іх генетычныя характарыстыкі з традыцыйнымі псіхалагічнымі тэстамі, каб устанавіць найбольш інфарматыўныя гены.

— Мы ўжо выяўляем некаторыя генныя камбінацыі, якія абумоўліваюць устойлівасць або, наадварот, адчувальнасць да стрэсаў, але казаць пра масавае практычнае выкарыстанне вынікаў нашай работы пакуль заўчасна. Хоць некаторыя ведамствы ўжо сёння праяўляюць інтарэс да нашых даследаванняў. Генетычны аналіз мог бы істотна дапамагчы ім у адборы найбольш перспектыўных супрацоўнікаў.

Рэспубліканскі цэнтр геномных біятэхналогій Інстытута генетыкі і цыталогіі сёння актыўна працуе па кірунках «медыцынская генетыка» і «генетыка спорту». Ужо распрацаваны метады геннай дыягностыкі па 19 сацыяльна значных захворваннях. ДНК-тэсціраванне дазваляе выявіць схільнасць, напрыклад, да інфаркту міякарда, атэрасклерозу, ішэмічнай хваробы сэрца, астэапарозу, дыябету, вянозных трамбозаў, рэўматоіднага артрыту і гэтак далей. Асабліва актуальная такая інфармацыя для людзей, сваякі якіх мелі ў анамнезе гэтыя захворванні. Веды пра генетычную схільнасць да развіцця захворванняў дазваляюць ажыццявіць раннюю дыягностыку паталогій, карэктна вызначыць прагноз развіцця небяспечных ускладненняў і правільна выбраць метады прафілактыкі і лячэння.

Па словах **галоўнага вучонага сакратара Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандра КІЛЬЧЭЎСКАГА,** у Рэспубліканскім цэнтры геномных біятэхналогій Інстытута генетыкі і цыталогіі ўжо створаны банк ДНК 500 спартсменаў з 30 алімпійскіх і нацыянальных каманд. Пратэсціраваны алімпійская зборная каманда Беларусі па біятлоне, нацыянальныя каманды Беларусі па хакеі, тэнісе, прадстаўнікі нацыянальнай зборнай і хакеісты мінскага спартыўнага клуба «Дынама».

Пры ДНК-пашпартызацыі спартсменаў даследаваліся гены, ад якіх залежаць цягавітасць, сіла і хуткасць, гены, што аказваюць істотны ўплыў на стан апорна-рухальнага апарату, адаптацыю да гіпаксіі, здольнасць да аднаўлення пасля фізічных нагрузак, гены росту новых крывяносных сасудаў і гены транспарту кіслароду; гены, адказныя за ломкасць касцей і за рызыку трамбозу; гены сардэчна-сасудзістай сістэмы і вугляводна-тлушчавага абмену.

Фактычна генетыкі могуць сёння падказаць юным спартсменам, у якім відзе спорту яны змогуць дасягнуць самых высокіх вынікаў, каб не марнаваць дарэмна час і сілы. Могуць выявіць, спрынтарам вырасце дзіця ці стаерам. У лабараторыі генетыкі чалавека можна прайсці ДНК-дыягностыку схільнасці да высокіх спартыўных дасягненняў, вызначыць гены спартыўнай адоранасці і неспрыяльныя для спорту гены. Бо калі генетыкай спартыўныя дасягненні ў чалавеку не запраграмаваны, то нават кругласутачныя трэніроўкі не прынясуць жаданага выніку...

Да таго ж генетычнае тэсціраванне спартсменаў дазваляе захаваць іх здароўе, распрацаваць індывідуальны рэжым трэніровак, мінімізаваць магчымыя рызыкі ў атлетаў, напрыклад, папярэдзіць выпадкі раптоўнай смерці падчас фізічных нагрузак — на трэніроўках або спаборніцтвах. Усяго за шэсць гадоў дзейнасці Рэспубліканскага цэнтра геномных біятэхналогій генетычнае тэсціраванне тут прайшлі 8886 чалавек. Аб'ём рэалізаваных паслуг склаў 6515,0 млн недэнамінаваных рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*


| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| **Продавец** | ОАО «МПОВТ», г. Минск, ул. Притыцкого, 62 | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| Здание административно-бытового корпуса №2 (Литер Г 4/к) | Здание административно-хозяйственное | 799,0 кв. м | 500/С-31575 | г. Минск, ул. Притыцкого, 62 |
| **Начальная цена с НДС** | **294 779, 10 бел. руб. (BYN)** | | | |
| **Сведения о земельном участке:** площадь – **0,4555 га,** предоставлен в общую долевую аренду сроком по 31 августа 2053 г. (доля продавца в праве аренды: 1/5). Целевое назначение: для эксплуатации и обслуживания зданий административно-хозяйственных и зданий специализированных иного назначения. Ограничения: охранная зона сетей и сооружений ЛЭП, водоснабжения, канализации, теплоснабжения, газоснабжения (пл. 0,1547 га) | | | | |
| **Дополнительная информация:** начальная цена снижена на 30%. Обременения: площади здания частично сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона и продавца | | | | |
| **Задаток 5%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **15** (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона | | | | |
| **Условия оплаты:** по согласованию с продавцом возможно предоставление рассрочки оплаты предмета аукциона. В случае если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней **после заключения договора купли-продажи** | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения покупателем затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **WWW.CPO.BY** | | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в г. «Звязда» 06.10.2016 г. | | | | |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **05.04.2017 в 14.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата, время, место окончания приема документов** | **03.04.2017 до 17.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 (17) 280-36-37; +375 (29) 317-95-42; auction@cpo.by; www.cpo.by** | | | |

# ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ЭКАНОМІЯ

## Метад бізуна і перніка

**Начальнік упраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і сродкамі масавай інфармацыі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь АКСЦІЛОВІЧ** кажа, што цяпер каля 94% жылфонду мае сістэмы аўтаматычнага рэгулявання спажывання цяпла.

Паводле яго слоў, усяго дамоў з цэнтральным ацяпленнем, якія маюць тэхнічную магчымасць абсталявання такімі сістэмамі, каля 27 тысяч. Больш за 25,5 тысячы дамоў сёння працуюць з аўтаматыкай. «Засталіся толькі жылыя дамы, што з'яўляюцца аб'ектамі малапавярховай забудовы. Па іх ёсць тэхнічныя пытанні, але яны вырашаюцца», — запэўніў Генадзь Аксціловіч.

На сённяшні дзень пакватэрныя лічыльнікі і рэгулятары цяпла стаяць прыблізна ў 2,7 тысячы жылых дамоў, што складае 10% ад эксплуатаванага шматкватэрнага жыллёвага фонду. Спецыяліст паведаміў, што, паводле праведзенага аналізу, скарачэнне цеплаcпажывання жылога дома, дзе стаяць пакватэрныя лічыльнікі, пры іншых роўных умовах дасягае 10—15%. Эканомія сур'ёзная. Аднак пакуль многія не спяшаюцца іх прымяніць. Нагадаю, што яшчэ летась планавалася з 2017 года перайсці на абавязковы разлік па індывідуальных прыборах уліку за цеплавую энергію там, дзе гэтыя прыборы ўстаноўлены. Высветлілася, што аднымі перакананнямі тут абысціся наўрад ці ўдасца.

Спецыялісты з Дэпартамента па энергаэфектыўнасці вырашылі выкарыстоўваць эканамічныя метады стымулявання аплаты цеплаэнергіі па індывідуальных прыборах уліку. «Сёлета створана рабочая група пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Калініна. Распрацаваны праекты пастаноў урада, дзе прадугледжваюцца эканамічныя метады стымулявання грамадзяніна, які мае ва ўласнасці кватэру, абсталяваную індывідуальнымі прыборамі ўліку цеплавой энергіі, разлічвацца па паказаннях лічыльніка», — адзначыў Міхаіл Малашанка.

Асабіста ад сябе магу заўважыць, што ў маёй кватэры гэтыя лічыльнікі на батарэях стаяць. Ёсць у нас і кранікі, што рэгулююць падачу цяпла. Дык вось, жыхары ўсіх кватэр на працягу зімы ў доме плацяць за цяпло адпаведна плошчы кватэры — усе аднолькава. А вясной інфармацыя па гэтых лічыльніках збіраецца і аналізуецца. Тым, хто кранік падкручваў і цяпло зімой эканоміў, праз сістэму жыровак пераплачаныя грошы вяртаюць. А тым, хто гэтага не робіць, прыходзіцца даплачваць. Напрыклад, мне летась за ацяпленне двухпакаёвай кватэры 350 тысяч рублёў старымі вярнулі.

## «Паставіць на лічыльнік» стары фонд?

Акрамя таго, цяпер распрацоўваецца праграма забеспячэння індывідуальнымі прыборамі ўліку цеплавой энергіі тых дамоў жыллёвага фонду, дзе іх сёння няма, расказаў Міхаіл Малашанка. Днямі спецыялісты Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі агучылі кошт арганізацыі пакватэрнага ўліку цяпла пры вертыкальнай разводцы. Гэта пакуль прыблізныя лічбы. Генадзь Аксціловіч растлумачыў, што арганізацыя



пакватэрнага ўліку і рэгулявання спажыванай цеплаэнергіі пры вертыкальнай разводцы магчымая шляхам аснашчэння кожнага ацяпляльнага прыбора рэгулятарамі і размеркавальнікам цеплавой энергіі, якія дазваляюць вызначыць долю кожнага памяшкання ва ўдзельным аб'ёме спажытай усім домам энергіі. Так, кошт размеркавальніка электроннага тыпу складае каля 30 рублёў, тэрмарэгулятара — ад 20 да 80 рублёў у залежнасці ад тыпу. Аснашчэнне аднаго ацяпляльнага прыбора размеркавальнікам цяпла і тэрмарэгулятарам (з улікам мантажных работ) абыдзецца ў суму каля 130 рублёў.

Адразу ўзнікае пытанне: хто будзе гэтым займацца і прафінансуе? Спецыялісты згаджаюцца, што праграма дзяржаўная, але сёння каля 95% жылога фонду знаходзіцца ва ўласнасці насельніцтва. Таму цалкам зразумела, што ў фінансаванні энергаэфектыўных мерапрыемстваў, якія ў канчатковым выніку павышаюць спажывецкія якасці кватэр і, адпаведна, рынкавы кошт жылля, павінны ўдзельнічаць і яго ўласнікі.

## Святло — цяпло: 72 на 17

Эксперты адзначаюць, што энергаэфектыўнае будаўніцтва стрымлівае ў нашай краіне парушэнне парытэту коштаў на цяпло і электраэнергію.

Сёння насельніцтва пакрывае 72% выдаткаў на электраэнергію і ўсяго толькі 17% на цяпло, паведаміў Міхаіл Малашанка. Такая неадпаведнасць з'яўляецца адной з прычын таго, што жыхары дамоў, дзе ёсць сістэма прымусовай вентыляцыі з рэкуперацыяй цяпла, не імкнуцца карыстацца сучасным абсталяваннем, паколькі для яго работы неабходна электрычнасць. Акрамя таго, пры сучасных нізкіх тарыфах на цяпло насельніцтву нявыгадна пераплачваць пры куплі жылля за ўстаноўку абсталявання, якім, хутчэй за ўсё, эфектыўна карыстацца не давядзецца.

У Беларусі ёсць ужо нямала дамоў, якія прэтэндуюць на званне энергаэфектыўных. Каля двух дзясяткаў з іх аснашчаны сістэмай рэкуперацыі цяпла вентыляцыйных выкідаў. Тры жылыя будынкі (у Мінску, Гродне і Магілёве) пабудаваны ў рамках праекта праграмы развіцця ААН і глабальнага экалагічнага фонду «Павышэнне энергетычнай эфектыўнасці жылых будынкаў у Рэспубліцы Беларусь». На іх прыкладзе плануецца паказаць, як комплекснае ўкараненне існуючых тэхналогій дазваляе дасягнуць жаданага выніку. У прыватнасці, акрамя сістэм рэкуперацыі, плануецца ўстаноўка цеплавых помпаў і сонечных калектараў, а таксама выкарыстанне цяпла сцёкавых вод у Магілёве і Гродне — недалёка ад праектаваных будынкаў праходзяць гарадскія каналізацыйныя калектары. Аднак пакуль энергаэфектыўныя дамы варта разглядаць як жыллё павышанай камфортнасці са здаровым мікракліматам, правільная эксплуатацыя якога дасць магчымасць палепшыць экалагічную абстаноўку і эканоміць паліўна-энергетычныя рэсурсы краіны.

Паводле слоў спецыялістаў, у жыллёвым сектары ёсць велізарныя рэзервы для зніжэння энергаёмістасці валавога ўнутранага прадукту і замяшчэння імпартаваных відаў паліва. Жыллёвы фонд Беларусі валодае значным патэнцыялам у сферы энергазберажэння і скарачэння выкідаў парніковых газаў. У сектары ЖКГ выкарыстоўваецца каля 38% паліўна-энергетычных рэсурсаў, якія спажывае краіна ў цэлым. Улічваючы ўзрастаючую ролю эканоміі цеплавой і электрычнай энергіі, вялікае значэнне варта надаваць будаўніцтву энергаэфектыўнага жылля, асабліва класаў энергаэфектыўнасці дамоў А і А+, лічыць дырэктар дэпартамента.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


### ИНФОРМАЦИЯ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ ПО АКЦИЯМ

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» (Республика Беларусь, 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49) сообщает, что очередным общим собранием акционеров данного общества, состоявшимся 21.03.2017, принято решение о выплате дивидендов за IV квартал 2016 года из расчета 0 рублей 71 копейка на одну простую (обыкновенную) акцию.

Выплата дивидендов по акциям за IV квартал 2016 года будет производиться с 27.03.2017 по 31.07.2017 года.

Порядок выплаты дивидендов акционерам:

- юридическим лицом – путем зачисления на их расчетные счета,
- физическим лицом – дивиденды выплачиваются через кассу ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» или высылаются почтовым переводом.

УНП 400078768


## ИЗВЕЩЕНИЕ

### о проведении аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков

### Арендодатель – Свислочский районный исполнительный комитет

| № п/п | Местонахождение участка | Кадастровый номер, площадь и срок аренды | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы по подготовке (без учета стоимости опубликования извещения), руб. | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | г.п. Порозово, ул. Социалистическая, У-1 | №425255700001000218 0,0060 га, 10 лет | 64 р. 8 к. | 6 р. 41 к. | 59 р. 90 к. | Для размещения объектов розничной торговли | Существует возможность подключения к сетям: электричество, водоснабжение, с условиями |
| 2 | г.п. Порозово, ул. Ленина, У-503 | №425255700001000545 0,0029 га, 10 лет | 30 р. 97 к. | 3 р. 10 к. | 30 р. | Для размещения объектов розничной торговли | Существует возможность подключения к сетям: электричество, водоснабжение, с условиями |
| 3 | г. Свислочь, ул. Гагарина, У-727 | №425250100001002151 0,0031 га, 10 лет | 46 р. 73 к. | 4 р. 68 к. | 54 р. | Для размещения объектов розничной торговли | Существует возможность подключения к сетям: электричество, газоснабжение, водоснабжение, канализация, с условиями |
| 4 | г.Свислочь, ул.Цагельник, У-197 | №425250100001001753 0,0046 га, 10 лет | 94 р. 79к. | 9 р. 48 к. | - | Для размещения объектов розничной торговли | Существует возможность подключения к сетям: электричество, газоснабжение, водоснабжение, канализация, с условиями |

**Условия, связанные с формированием земельных участков:**
в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения), возместить затраты на организацию и проведение и выполнить условия, предусмотренные в решениях о формировании земельных участков для проведения аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

**Примечание:**

1. Аукцион состоится в **14.30 26 апреля 2017 года** в зале заседаний райисполкома по адресу: г. Свислочь, ул. Ленина, 2.
2. Для участия в аукционе необходимо в срок **до 17.00 21 апреля 2017 года** представить следующие документы:

- заявление на участии в аукционе;
- заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение суммы задатка на счет ГУ МФ РБ 3600524000142, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 795, УНН 500563252, код платежа 04002;
- гражданам – копии документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателям – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающие полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

3. Порядок проведения аукциона определяется Положением о порядке организации и проведении аукционов по заключению договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров республики Беларусь от 26 марта 2008 г. №462.
4. Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников.
5. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10%.
6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельными участками в натуре.
7. Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гродненская область, г. Свислочь, ул. Ленина, 2, каб. №1 с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (выходные дни – суббота и воскресенье), до **17.00 21 апреля 2017 г.**
8. Контактные телефоны: 8 (01513) 34629, 32676.

**Сайт райисполкома www.svisloch.grodno-region.by.**


Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**


### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест Белтрансстрой», г. Минск, ул. Советская, 8 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | | |
| **ФОК** | Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения | 764 кв. м | 350/С-111202 | г. Гомель, ул. Демьяна Бедного, 7 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, тамбур, крыльца | | | | |
| Сведения о земельном участке: пл. 0,4061 га. Целевое назначение: для эксплуатации и обслуживания общежития, физкультурно-оздоровительного комплекса СМП № 116, административного помещения. Доля продавца в праве постоянного пользования на земельный участок:917/1000. | | | | |
| Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона. | | | | |
| **Начальная цена Лота №1 с НДС** | 275 690, 67 бел. руб. (BYN) | | | |
| **Лот №2** | | | | |
| **Механический склад цемента** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 45,2 кв. м | 100/С-47322 | г. Брест, ул. Карасева, д. 100 |
| **Начальная цена Лота №2 с НДС** | **18 540 бел. руб. (BYN)** | | | |
| **Лот №3** | | | | |
| **Здание компрессорной станции** | Здание специализированное иного назначения | 62,4 кв. м | 100/С-47332 | г. Брест, ул. Карасева, д. 100 |
| **Начальная цена Лота №3 с НДС** | 35 844 бел.руб. (BYN) | | | |
| **Лот №4** | | | | |
| **Растворный узел** | Здание специализированное иного назначения | 498,7 кв. м | 100/С-47330 | г. Брест, ул. Карасева, д. 100 |
| **Начальная цена Лота №4 с НДС** | **24 751, 44 бел.руб. (BYN)** | | | |

Сведения о земельном участке: Лоты № 2-4, расположены на земельном участке пл. 0,8420 га, предоставленным продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы. Продавец, в зависимости от количества реализованных лотов, в установленном законодательством порядке после проведения аукциона обращается за осуществлением регистрационных действий в отношении земельных участков, необходимых для обслуживания предметов аукциона. После выделения самостоятельного земельного участка для обслуживания реализованного лота (лотов) между продавцом и покупателем в течение 10 (десяти) рабочих дней после получения продавцом свидетельства о государственной регистрации земельного участка должен быть заключен договор купли-продажи

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.04.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Советская, 8 ОАО «Трест Белтрансстрой»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **21.04.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 (17) 280-36-37; +375 (29) 317-95-42; auction@cpo.by; www.cpo.by** |

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
23 САКАВІКА 2017 г.
ЧАЦВЕР
№6 (15813)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Сяргей КАЛЕНДА:

# «Псеўданім даў мне сілы ісці далей»




**Калі пералічваць усе кнігі, літаратурныя праекты, аўтарам якіх з'яўляецца Сяргей КАЛЕНДА, то не хопіць пальцаў абедзвюх рук. Больш як дзясятак папяровых і электронных выданняў прозы, амаль столькі ж выпускаў часопіса «Макулатура», мноства публікацый у беларускай перыёдыцы... Здаецца, што Сяргей мае нейкі сакрэт надзвычайнай працавітасці, умення прывабіць творчую музу і прыцягнуць увагу чытачоў. Але пры гэтым ён не надта клапоціцца пра прызнанне калег і не імкнецца заваяваць прыязнасць крытыкаў. Каб дыстанцыявацца ад уласнай асобы і вобраза, што склаўся, нават прыдумаў сабе творчае альтэр-эга — Аляксандр Бацкель. Пра тое, навошта паспяховы малады празаік пачаў пісаць пад псеўданімам, як рэагуе на непрыманне калег і які творчы лёс усё ж такі чакае Бацкеля, мы сёння гутарым з Сяргеем Календам.**

***— Калі параўнаць тваю творчасць гадоў дзесяць таму, у пачатку шляху ў літаратуру, і сёння, што змянілася, а што засталося ранейшым?***

— Усё змянілася кардынальна. Я быў зусім малады, шмат у чым спяшаўся, і ў мяне на першых этапах не было дарадцаў, якім я мог бы давяраць. У прынцыпе, засталіся толькі творчы імпэт і любоў да літаратуры. Усё астатняе памянялася настолькі, што я нават не знайду такой рысы, якая была ў мяне дзесяцігоддзе таму і зараз захавалася. Можа, гэта і добра, бо сваёй апошняй на гэты час кнігай «Падарожжа на край ложка» я развітаўся з сабой ранейшым.

***— І якой будзе твая проза новага ўзору?***

— Не ведаю, наколькі мая задумка рэалізуецца і будзе цікавай чытачу, але я збіраюся пісаць гатычныя казкі. Раней таксама звяртаўся да гэтага жанру, але тое былі творы для дзяцей, вельмі лёгкія, філасофскія. Рэдактарка кажа, што незразумела, для якога ўзросту мае новыя тэксты: у іх усё занадта гатычна, перабольшана, але галоўнымі героямі з'яўляюцца дзеці.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Не адарвацца ад вытокаў

# ЧАГО ДУША ПРОСІЦЬ?

## ЯК НА ТРАДЫЦЫЯХ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ ВЫХАВАЦЬ АСОБУ

**Уявіце сабе: вы любіце плаваць, займаецеся гэтым відам спорту, але аднойчы прыходзіце ў басейн, а ён... пусты. І вам кажуць, што вадой басейн больш напаўняцца не будзе. Падобная сітуацыя склалася ў 2008 годзе, калі раптам са школьнага курса знік прадмет «Сусветная мастацкая культура». У верасні 2015 года гэту памылку выправілі, але ўсё роўна прадмет «Мастацтва. Айчынная і сусветная мастацкая культура» пакуль выкладаецца толькі ў пятых і шостых класах. У наступным годзе да іх далучацца сёмыя. А праз год — восьмыя класы...**

### Эйнштэйн і Фёдар Дастаеўскі

— Падрастаючаму пакаленню пастаянна ўнушаюць думку, што трэба займацца дакладнымі навукамі, эканомікай, вывучэннем замежных моў, бо менавіта за імі будучыня. І не дзіўна, што на шляху да стварэння «сіліконавай даліны» знайшліся аргументы на карысць таго, што ад вывучэння сусветнай мастацкай культуры можна адмовіцца без асаблівых страт. Так сталася, што менавіта гэта дысцыпліна аказалася самым уразлівым звяном у школе, — падзяліўся сваімі думкамі з удзельнікамі рэспубліканскага форуму **педагог дадатковай адукацыі народнай арт-студыі «Востраў» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Юрый ІВАНОЎ.** — Між іншым, культура з'яўляецца наймагутнейшым фактарам эканамічнага развіцця. Сёння нас акружае прадметнае асяроддзе, створанае заходняй цывілізацыяй, і мы можам і далей стаяць у чарзе па чужыя дасягненні, плаціць за чужы дызайн, таму што ў нас у гэтым плане цяпер назіраецца страшэнны крызіс.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Заўсёды побач

# Сямейны патруль правапарадку

## Яны разам і дома, і на службе

**Маладая сям'я міліцыянераў расказвае пра першыя крокі ў прафесіі, развейвае стэрэатыпы наконт службовых раманаў, разважае пра адказнасць і дзеліцца планамі на будучыню.**




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### ДЗЯЎЧЫНА Ў ФОРМЕ І... РАШУЧАСЦЬ

— Добра, што вы без абцасаў і ў доўгім паліто, — акінуўшы мяне поглядам, канстатаваў **сяржант міліцыі Андрэй БАЧКО, міліцыянер першага ўзвода ППСМ грамадскай бяспекі УУС адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска.** — Самі разумееце, на дварэ не май, а хадзіць прыйдзецца шмат.

Пра «шмат» я зразумела толькі назаўтра, калі мае ногі пачалі «скардзіцца»... Але гэта было ўжо пасля змены з пешым патрулём.

— Работа ў нас ёсць заўсёды, але менавіта ў пятніцу людзі расслабляюцца пасля цяжкіх працоўных дзён і пачынаюць адпачываць, хто на што здатны. Вельмі часта такое «свята» заканчваецца ўмяшаннем міліцыі, — хутка ўводзіць у курс справы **прапаршчык міліцыі Валянціна БАЧКО.**

Сваю ролю тут адыгрывае і пара года, надвор'е. Зараз, напрыклад, парушальнікаў, якія распіваюць спіртныя напоі на зялёнай зоне або дзіцячай пляцоўцы, няшмат, але сітуацыя зменіцца з першым «упэўненым» сонцам.

— Я да гэтага ўжо прызвычаіўся, — заўважаючы маю зацікаўленасць тым, як глядзяць людзі на Валю, кажа Андрэй. — А вось яна дагэтуль адчувае сябе неяк няёмка.

Як прызналася Валя, яна сапраўды не разумее, што асаблівага ў дзяўчыне ў форме. «Мабыць, іх здзіўляе тое, што я патрулюю?» — выказвае здагадку прапаршчык.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

*Педсавет*

# БРАК НАСТАЎНІКА НЕ ВЫПРАВІЦЬ

**Задача педагогаў не толькі навучыць дзяцей свайму прадмету, але і захапіць ім школьнікаў. Пры гэтым трэба працаваць не толькі з малымі, але і з іх бацькамі. Разам з тым сучасныя настаўнікі не гатовыя да працы з усёй сям'ёй, выхаваўчая функцыя неўласцівая ім. Гэтыя і іншыя думкі гучалі на міжнароднай канферэнцыі «Сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога сям'і: вопыт, праблемы, перспектывы».**

Выступаючы перад будучымі настаўнікамі, студэнтамі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка і навучэнцамі ВНУ з яшчэ шасці краін, **Марыяна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, старшыня Беларускага саюза жанчын,** разважала пра ролю бацькоў і педагогаў у выхаванні дзяцей. Яна падкрэсліла, што адміністрацыйным шляхам ад малых нічога не даб'ешся, таму выхаваўчая роля педагога становіцца ўсё больш адказнай.

— Частка з вас прыйшлі вучыцца на настаўніка, каб атрымаць вышэйшую адукацыю. Гэта катаванне, калі ты не любіш прафесію і працуеш у школе, — заўважыла Марыяна Шчоткіна. — Рабочы на заводзе можа сапсаваць дэталь, выкінуць яе і зрабіць іншую. А калі педагог дапускае ў працы брак, гэта не выправіць ніколі. Ды яшчэ і чалавек атрымае комплекс на ўсё жыццё.

Яна заклікала захоўваць чалавечыя каштоўнасці, якія ёсць у краіне, і рабіць так, каб было здорава жыць на Радзіме, а не ехаць за яе межы. Думкі новага пакалення залежаць ад таго, што гавораць і чаму вучаць бацькі і педагогі.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

*Хачу на журфак!*

# ПРА ТЭМЫ І МОВУ

**Бадай, адзін з самых складаных момантаў для будучых «акул пяра» — гэта выбар тэмы для матэрыялу. Што казаць, з названай праблемай сутыкаюцца не толькі школьнікі-абітурыенты, але і студэнты журфака, і нават маладыя спецыялісты. Гэта параджае штампы: з году ў год рэдакцыі прапануюць «пробы пяра» на абмежаваную і прадказальную колькасць тэм. Так, напрыклад, для студэнтаў гэта будзе тэма падарожжаў аўтастопам: ці з уласнага досведу, ці з аповедаў сяброў. Тлумачыцца ўсё проста. Маладыя людзі адчулі сябе дарослымі, ім хочацца адрэналіну, новых уражанняў, вандровак, тым больш такім папулярным зараз спосабам. І нічога дрэннага ў тым няма, тэма, як тэма, мае права на жыццё. Але калі яе прапануе кожны другі (а то і першы) практыкант... Але вернемся да абітурыентаў. Якія клішэ характэрныя для іх?**

Па-першае, родная мова (два-тры гады таму пальму першынства з ёй дзяліла тэма інтэрнэт-залежнасці ў асяроддзі маладых людзей: за год мы атрымлівалі па некалькі дзясяткаў «проб пяра» па азначанай праблеме). Па-другое, краязнаўчая тэма — гісторыі пра край, адкуль родам аўтар. Па-трэцяе, вядомыя людзі рэгіёна: ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і працы, «афганцы», «чарнобыльцы» і г. д. Самі па сабе ўсе тэмы добрыя, толькі ў рэдкага юнага ці маладога аўтара атрымліваецца іх раскрыць. Чаму?

Агульная заўвага: пры напісанні матэрыялаў большасць падыходзіць да іх як да школьнага рэферата. Іншымі словамі, з адкрытых крыніц — кніг, інтэрнэту, экспазіцый школьнага музея — папросту перапісваюцца біяграфія героя ці гістарычныя звесткі пра пэўную мясцовасць. Усе гэтыя крыніцы выкарыстоўваць можна і трэба, але толькі як дадатковыя. А ў аснове журналісцкага матэрыялу павінны быць жывыя стасункі: з героем вайны, сведкам тых ці іншых падзей. Калі мы гаворым пра краязнаўчую тэматыку, гэта можа быць гутарка з гісторыкам, археолагам, работнікам музея. Пішучы такі матэрыял, аўтар можа выказаць сваё асабістае стаўленне да героя, падзеі, што толькі надасць «пробе пяра» жывасці, эфекту датычнасці.

З іншага боку, рабіць гэта трэба сціпла і сцісла. Не трэба ставіць перад сабой усяленскую праблему і гэтак жа імкнуцца яе вырашыць. Так звычайна бывае, калі нашы няштатныя аўтары спрабуюць выказацца на тэму роднай мовы. Цікавасць да яе з боку маладых людзей не можа не радаваць, але на выхадзе мы часцей за ўсё атрымліваем сухі пафасны «опус» з мноствам цытат, адсылаў у гістарычнае мінулае і спробай прагнозу на будучыню... А чаму б проста не напісаць, як сам абітурыент пачаў размаўляць на роднай мове, як пасля гэтага змяніўся яго светапогляд, кола яго інтарэсаў? (Не ўспрымайце як заклік усім разам пісаць пра гэта.)

Насамрэч тэмы — вакол, толькі азірніцеся. У вашым жа маладзёжным асяроддзі. Будучы журналіст павінен мець не толькі вострае пяро, але і такія ж вочы. Прыглядайцеся! Побач можа быць равеснік з незвычайным хобі. А хтосьці дабіўся сур'ёзных вынікаў у спорце, нейкім відзе мастацтва — чым не нагода напісаць пра тое? Зладзілі цікавы паход, арганізавалі квэст сваімі сіламі? Таксама тэмы. Валанцёры вашага атрада дапамагаюць ветэрану? Раскажыце пра гэта і не забудзьцеся распытаць пра жыццёвы шлях паважанага чалавека. Ведаеце хлопца ці дзяўчыну, якія пішуць песні і ўжо маюць сваю аўдыторыю слухачоў? Гэта нагода сустрэцца з імі. У вашай школе цікавая насценная газета? А чаму б не ўзяць інтэрв'ю ў яе рэдактара, не расказаць пра самы запамінальны матэрыял? Словам, шукайце цікавых суразмоўцаў і незвычайныя факты.

І яшчэ. Пішыце лёгка, так, як вы размаўляеце паміж сабой, абмяркоўваючы нейкія навіны, будзённыя справы. У рэшце рэшт, матэрыялы ж вы рыхтуеце найперш для сваіх равеснікаў, а не рэдактараў у газеце, так? Дык і гаварыце з імі на адной мове. У пэўных выпадках дапускаецца нават ваш маладзёжны слэнг.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ЧАГО ДУША ПРОСІЦЬ?


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Нам проста катастрафічна не хапае ведаў і па сучаснай, і па традыцыйнай культуры. Нашы дзеці рызыкуюць аказацца неканкурэнтаздольнымі таму, што менавіта мастацкая культура закладвае асновы развіцця асобы. Калі ў Эйнштэйна запыталіся, што дапамагло яму адкрыць тэорыю адноснасці, той прызнаўся, што вельмі захапляўся на той момант творчасцю Фёдара Дастаеўскага. Здавалася б, дзе класік літаратуры, а дзе — фізіка? Між іншым, напэўна, існуюць нейкія тайныя хады, невядомыя нам сувязі, якія дапамагаюць нават прадстаўнікам прыродазнаўчых і дакладных навук здзейсніць свае адкрыцці, знаходзячыся ўнутры душэўных перажыванняў літаратурных герояў, унутры сусветнага культурнага вопыту. Я лічу, што ў 2008 годзе ў нашай школе адбылася гуманітарная катастрофа, прычым бацькі не забілі трывогу, хоць пацярпела ў першую чаргу сям'я...

«Калі дзіця вывучае нейкі прадмет у школе, бацькі набываюць яму альбомы, энцыклапедыі, дадатковыя кнігі. За сусветнай мастацкай культурай стаяла пэўная мова, яна таксама знікала са стасункаў у сям'і, — падкрэслівае Юрый Іваноў. — І калі мы сёння цытуем у размове Ільфа і Пятрова, Гашэка ці Чэхава, то бачым, што нас не разумеюць, таму што адсутнічае агульны культурны падмурак. Паміж пакаленнямі адбыўся культурны разрыў. Па сутнасці, педагогі дадатковай адукацыі сталі апошнім прытулкам для дзяцей, таму што толькі ў аб'яднаннях па інтарэсах можна паразважаць пра душу чалавека, звярнуцца да нашых каранёў і традыцый. Тут любое дзіця можа праявіць сябе, нават калі ў школе ў яго не складваюцца «адносіны» з матэматыкай ці фізікай. Прычым дарослым мы ўдзяляем нават больш увагі, чым дзецям, таму што выхаванне трэба распачынаць з іх...»

**Галоўнай тэмай рэспубліканскага педагагічнага форуму, які прайшоў у сценах Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, стала выхаванне навучэнцаў сродкамі традыцыйнай беларускай культуры.**

— Па-за засваеннем каштоўнасцяў культуры не можа весціся размова ні пра якую сучасную адукацыю і выхаванне, — упэўнены **доктар філасофскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, віцэ-прэзідэнт Беларускай эстэтычнай асацыяцыі Вадзім САЛЕЕЎ.** — Я выкладаю будучым дызайнерам у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Гэта вельмі крэатыўныя людзі. Але як жа мне было балюча, калі ў групе з 20 чалавек толькі адна студэнтка змагла адказаць на пытанне «Хто такі Адам Міцкевіч?» Тое, што педагог павінен быць носьбітам культуры, — гэта аксіёма. Мае настаўнікі былі яркімі асобамі, якія нават сваёй прысутнасцю абуджалі ў нас інтарэс і матывацыю да навучання. Яны наведвалі тэатры і выстаўкі, разбіраліся ў літаратуры, былі ў курсе ўсіх кінанавінак. Але ці могуць пахваліцца шырынёй агульнай культуры цяперашнія маладыя педагогі? Педагог — гэта чалавек, вакол якога завязваюцца, у шырокім сэнсе, культурныя стасункі. Асобу можа выхаваць толькі яркая індывідуальнасць.

## З голасу ў голас, з нагі ў нагу

На такіх Педагогаў з вялікай літары пашанцавала выхаванцам Мётчанскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа Барысаўскага раёна.

А пачыналася ўсё дваццаць гадоў таму, калі ў Мётчанскую школу, якая ўжо мела свае педагагічныя набыткі, прыйшоў **вядомы фалькларыст і этнахарэограф Мікола КОЗЕНКА,** каб праз народны танец і іншыя мастацкія традыцыі Барысаўшчыны з дапамогай дзяцей і пры непасрэдным іх удзеле вывучаць і зберагаць аўтэнтычныя культурныя каштоўнасці вёскі і наваколля.

У 1996 годзе ён заснаваў фальклорны гурт «Берагіня». Яго дзейнасць — першы ў Беларусі вопыт сістэмнага выхавання сельскіх школьнікаў сродкамі традыцыйнай культуры. У 2001 годзе гурту было прысвоена званне «Узорны», а ў 2012-м — званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь». Сёння яго досвед вывучаюць на самых розных узроўнях не толькі ў нашай краіне, але і ў суседніх.

Дзеці рыхтуюцца стаць удзельнікамі гурта яшчэ ў садку, дзе педагогі распачынаюць развучваць з імі карагоды, танцы, песні, гульні. Малодшую групу называюць ласкава «Зярняткі». Ніякага адбору з улікам прыродных задаткаў не практыкуецца. І магчымасць да самавыяўлення можа знайсці літаральна кожнае дзіця. У падыходзе да выхаванцаў акцэнт робіцца на раскаванні і імправізацыі. Хоча дзіця тупнуць нагой або пляснуць у ладкі ці пасвойму выканаць «прысядку» падчас танца — няхай робіць гэта так, як яго душа просіць, як сэрца яму падказвае. Галоўнае, каб усё было шчыра.

— Мастацкая асаблівасць калектыву ў тым, што выканальніцкія традыцыі засвойваюцца ў вуснай форме — з нагі ў нагу, з рукі ў руку, з голасу ў голас, спосабам капіравання і сумеснага выканання, — тлумачыць **настаўнік беларускай мовы і літаратуры Мётчанскага вучэбна-педагагічнага комплексу, музычны кіраўнік фальклорнага гурта «Берагіня» Антаніна АБРАМОВІЧ.** — Эфектыўнымі вучэбнымі дапаможнікамі сталі для нас таксама аўдыя- і відэазапісы, зробленыя ў этнаграфічных экспедыцыях падчас кантактаў з носьбітамі традыцый.

**Старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, этнамузыколаг, кандыдат мастацтвазнаўства Тамара ВАРФАЛАМЕЕВА** упэўнена, што аўтэнтычныя формы традыцыйнай культуры толькі тады захоўваюць сваю непаўторнасць і арыгінальнасць, калі яны перадаюцца вусным шляхам. А калі параўноўваеш вынікі навучання ў пісьмовай і ў вуснай традыцыі, то заўважаеш істотную розніцу: там, дзе дзеці навучаліся вусна, абавязкова фарміруюцца стыхійныя лідары. Падчас выступленняў на сцэне, нават калі дзіця забывае словы ці нейкі рух у танцы, яно не губляецца. У такіх дзяцей вельмі добра развіта імправізацыя.

Выступленні «Берагіні» нагадваюць цікавую гульню, на працягу якой дзеці танцуюць, спяваюць, іграюць на музычных інструментах, расказваюць казкі і байкі. Увогуле педагогі пераканаліся, што выхаванне праз народную творчасць вельмі эфектыўнае. Дзеці, якія пастаянна вывучаюць традыцыйную культуру, больш здольныя да ўсяго. Яны ўмеюць і вышываць, і ткаць, і плесці з саломкі...

Удзельнікі «Берагіні» не толькі практычна асвойваюць адноўленыя старадаўнія ўзоры абрадавай і неабрадавай музычнай і харэаграфічнай культуры, але і сваімі рукамі пры дапамозе настаўнікаў і бацькоў вырабляюць самабытныя народныя касцюмы.

У навучальнай установе адбываецца вывучэнне сваіх каранёў: без дапамогі бацькоў навучэнцы не могуць аформіць свой радавод. Тым даводзіцца прыгадваць гісторыю сям'і ў імёнах і датах. Такім чынам адбываецца збліжэнне дзяцей, бацькоў і настаўнікаў. Праз установу адукацыі адбываецца трансляцыя і ўзнаўленне культурных нормаў, у тым ліку культуры побыту, каштоўнасцяў, якія ўключаюць у сабе маральнае здароўе і сацыяльны аптымізм, упэўненасць кожнага чалавека ў заўтрашнім дні, высокую культуру паводзін.

## Выцінанка — блізкая і родная

— У 1970-я — пачатку 1980-х гадоў народныя майстры кідалі сваё рамяство, бо традыцыйная культура лічылася набыткам учарашняй цёмнай вёскі. Але, на шчасце, сітуацыя кардынальна змянілася. Стаўшы самастойнымі, мы задумаліся, а што ж нас, уласна кажучы, вылучае сярод іншых еўрапейскіх народаў, — разважае **старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Яўген САХУТА.** — Вось толькі ставіцца да традыцый культуры трэба вельмі беражліва. Інтэрпрэтацыі дапускаюцца, але нельга апускацца да ўзроўню базарнага кітча, безгустоўшчыны і антымастацтва.

Яўген Сахута з сумам зазначае, што найбольш агрэхаў сёння заўважаецца ў стварэнні імітацыйных сцэнічных касцюмаў. Ці калі сувенірную ляльку апранаюць быццам бы ў народны касцюм. «У традыцыйнай беларускай вышыўцы і ткацтве прысутнічае вельмі моцны сімвалізм. Але зялёны колер, у адрозненне ад чырвонага, ніколі не быў сімвалічным у нашай культуры, а менавіта яго сёння шчодра дабаўляюць. Да таго ж я катэгарычна засцерагаю педагогаў ад набыцця ў кіёсках часопісаў з «сучаснай народнай вышыўкай». Гэта проста жах! Растлумачце лепш дзеткам, што азначае той ці іншы сімвал у нацыянальным арнаменце, каб яны маглі яго чытаць, як тэкст. Увогуле пазбягайце капіравання ўзораў з любых часопісаў. Гэта механічная работа, якая не мае нічога агульнага з творчасцю і мастацтвам».

З самых даступных відаў народнай творчасці Яўген Сахута прыгадаў выцінанку. Гэты твор прыкладнога мастацтва атрымліваецца ў выніку шматразовага складвання аркуша паперы і паўтарэння нанесенага матыву столькі разоў, колькі яна была складзена. Сурвэткі, фіранкі, карункі для ўпрыгожвання абразоў, вокнаў, паліц і палічак, калядныя зоркі, цацкі на ёлку з кардону, абажуры для лямпы — аздоба такога кшталту раней сустракалася амаль у кожнай сялянскай хаце.

— На ўроках выцінанкі вы можаце вучыць дзяцей усяму: там і кампазіцыя, і каларыстыка, і абагульненне... Усе мастацкія задачы можна выконваць, маючы пад рукамі толькі нажніцы, паперу і, вядома, фантазію, — падкрэслівае Яўген Сахута. — Або можна рабіць разам са сваімі выхаванцамі з рэчаў, што выйшлі з ужытку, звычайныя ходнічкі. Для гэтага не патрэбнае спецыяльнае абсталяванне. Між іншым, нярэдка ў юных майстроў атрымліваюцца такія прыгожыя прадметы побыту, што ніхто не скажа, што гэта не модна ці што гэта ўчарашні дзень.

Майстар упэўнены, што займацца трэба найперш тым, што нам блізкае і роднае, а ікебану і арыгамі, якія таксама ўсё часцей прапануюць у аб'яднаннях па інтарэсах, лепш усё ж такі пакінуць японцам...

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*По закліку сэрца*

# Прызванне — дапамагаць іншым

Маладыя хімікі стварылі найлепшы валанцёрскі атрад у краіне

**Валанцёрства звычайна называюць справай школьнікаў і студэнтаў: менавіта самым маладым хапае часу і сіл, каб і сваімі справамі займацца, і іншым дапамагаць. Але нават дарослае жыццё і бытавыя пытанні не замінаюць многім знаходзіць у сабе сілы на бескарыслівы клопат пра тых, каму няпроста. Добры прыклад — удзельнікі атрада «Сэрца Паліміра», што ўжо некалькі гадоў існуе на вядомым прадпрыемстве ў Наваполацку. Летась на конкурсе «Валанцёр года — Добрае Сэрца», што праводзіць БРСМ, яго прызналі пераможцам у намінацыі «Найлепшы валанцёрскі атрад сярод працоўнай моладзі». Пра сакрэты сумяшчэння працы і добраахвотніцтва расказала камандзір атрада, сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ завода «Палімір» Юлія ВЕКА.**



— Першапачаткова на нашым прадпрыемстве існаваў атрад пад назвай «Паліміравец», — згадвае гісторыю арганізацыі дзяўчына. — Ён быў не вельмі шматлікі — пара дзясяткаў чалавек. Тым не менш атрад актыўна дзейнічаў. У 2012 годзе ён перажыў невялікі «рэбрэндынг». У той час на прадпрыемства прыйшло шмат моладзі, і колькасць валанцёраў павялічылася. Сёння ў «Сэрцы Паліміра» афіцыйна налічваецца 94 удзельнікі. Але гэта толькі «касцяк». Насамрэч іх, вядома, значна больш, проста многія дапамагаюць час ад часу, калі з'яўляецца такая магчымасць. Нашы валанцёры — з самых розных цэхаў, прадстаўнікі розных прафесій. Што датычыцца патрабаванняў да тых, хто хоча да нас далучыцца, то іх фактычна няма: як можна нечага патрабаваць ад чалавека, які гатовы ахвяраваць сваім часам дзеля іншых?

Атрад працуе па некалькіх кірунках. У першую чаргу гэта дапамога дзецям. Напрыклад, у сацыяльна-педагагічным цэнтры Наваполацка знаходзяцца хлопчыкі і дзяўчынкі, бацькі якіх не ўдзяляюць дзецям належнай увагі. Валанцёры прыязджаюць да іх на святы, праводзяць канцэрты, набываюць адзенне і патрэбныя рэчы і проста бавяць час разам з тымі, каму не стае любові ад старэйшых. Акрамя гэтага, сярод работнікаў прадпрыемства многа шматдзетных сем'яў, «Сэрца Паліміра» займаецца іх апекай, у прыватнасці дапамагае падрыхтавацца да вучэбнага года. Іншы аспект працы — ветэраны, атрад падтрымлівае ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, супрацоўнічае з воінамі-інтэрнацыяналістамі. Юлія падкрэслівае, што, калі трэба набыць падарункі, фінансавую дапамогу аказвае працоўны калектыў, прафсаюзны камітэт і само прадпрыемства. Да таго ж не забываюцца тут і пра ветэранаў працы — атрад пастаянна наведваецца ў наваполацкую бальніцу сястрынскага догляду.

**Сярод валанцёраў «Сэрца Паліміра» больш хлопцаў. Гэта асабліва дапамагае ў працы па добраўпарадкаванні горада.**

— Найбольш усцешвае, калі ты бачыш, што зробленая праца прынесла плён, — дзеліцца камандзір атрада. — У нас была, напрыклад, такая гісторыя: гарадскі камітэт БРСМ звярнуўся з просьбай фінансава дапамагчы маме, якая вяла не самы ўзорны лад жыцця і не магла аплаціць інтэрнат, з-за чаго дзіця забралі ў сацыяльны прытулак. Валанцёры сабралі ўласныя сродкі і пагасілі запазычанасць. Ведаеце, у горшых выпадках бывае, што чалавек рэагуе неадэкватна і пачынае злоўжываць, маўляў, «заплаціць цяпер — заплаціць і потым». Але тут жанчына сапраўды змяніла свой лад жыцця. Нядаўна мы ездзілі да іх у госці (дзіця неўзабаве вярнулі дадому), яна дужа дзякавала нам, і ёсць надзея, што цяпер у сям'і ўсё будзе добра.

Як ні дзіўна, сярод валанцёраў «Сэрца Паліміра» больш хлопцаў. Тлумачыцца ўсё проста — на самім заводзе пераважна працуюць мужчыны. Гэта асабліва дапамагае ў працы па добраўпарадкаванні горада. Валанцёры даглядаюць мясцовыя помнікі (напрыклад, легендарнаму былому дырэктару «Паліміра» Льву Наважылаву), арганізоўваюць суботнікі, падтрымліваюць парадак у парку.

— У чым сакрэт таго, што мы паспяваем усё рабіць? Я думаю, справа ў саміх людзях, — разважае Юлія Века. — Мы не робім гэта «дзеля птушачкі», якіх-небудзь бонусаў ці ўзнагарод. Некаторым людзям проста неабходна дапамагаць іншым, такі ў іх лад жыцця. Калі адны знаходзяць час на свае хобі і захапленні, то мы займаемся валанцёрствам, бо інакш проста не можам. Не апошнюю ролю адыгрывае і прадпрыемства — кіраўніцтва заўсёды ідзе нам насустрач, калі трэба правесці нейкае мерапрыемства. Невырашальных пытанняў у нас няма.

Хоць валанцёрства па сваёй сутнасці справа бескарыслівая, усё ж цікавімся, што ўдзельнікі «Сэрца Паліміра» атрымліваюць узамен. На думку Юліі, своеасаблівым бонусам становяцца стасункі з калегамі і сумеснае баўленне часу: многія сябруюць паміж сабой, разам адпачываюць.

— Мы не заўсёды чуем ад людзей, якім дапамагаем, словы падзякі, але па вачах чалавека заўсёды відаць, наколькі важную справу для яго ты зрабіў, — адзначае Юлія. — Нярэдка даводзіцца чуць: калі ў нас так шмат валанцёраў, значыць, у краіне ўсё дрэнна, людзям без нас няма каму дапамагчы. Я з гэтым карэнным чынам не згодная. Валанцёры ёсць ва ўсім свеце, але сталі імі могуць не ўсе — гэта сапраўднае прызванне.



**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Наваполацк — Мінск.*




# Работа не для робатаў

**Калі вы офісны служачы (не кіраўнік), прадавец ці касір, кіроўца ці грузчык, повар ці афіцыянт, будаўнік, прыбіральшчык, ахоўнік ці фермер — у мяне для вас дрэнныя навіны. Па прагнозах вучоных-футуролагаў з Оксфардскага ўніверсітэта, ваша прафесія будзе цалкам аўтаматызавана да 2035 года. І гэта не толькі іх меркаванне: мільярдэр Марк К'юбан, прэзідэнт Сусветнага эканамічнага форуму Клаус Шваб і стваральнік кампаніі Microsoft Біл Гейтс лічаць гэтак жа.**

Скажыце, чарговыя казкі і ўтапічныя прагнозы? Той жа анлайн-перакладчык Google Translate чалавека пакуль не замяніў, а стаў сінонімам казусаў. Але час не стаіць на месцы: нядаўна амерыканскі пошукавік, які займаецца развіццём сэрвісу, абвясціў аб інтэграцыі ў алгарытм перакладу нейрасетак, што павінна вывесці якасць яго работы як мінімум на ўзровень не горшы за чалавечы. 3D-прынтары, што друкуюць ежу, пакуль не перамагаюць на конкурсах кулінараў, але ў кітайскім Харбіне даўно існуе рэстаран, дзе ўся работа — ад прыгатавання страў да дастаўкі іх кліентам — выконваецца робатамі. Нямецкія паштальёны таксама небеспадстаўна хвалююцца за сваю будучыню: з 2013 года служба Deutsche Post пачала выкарыстоўваць квадракоптары для дастаўкі пасылак у аддаленыя раёны.

Асабліва лёгка заўважыць працэс аўтаматызацыі ў асобных сферах. Скажам, у 2000 годзе ў сельскай гаспадарцы нашай краіны працавала 674 тысячы чалавек, цяпер — 434 тысячы. Наўрад ці нехта чуў пра беларускае, якія масава галадаюць, так? Аб'ёмы вытворчасці прадукцыі не падаюць, а выдаткі скарачаюцца — усё гэта робіцца дзякуючы прагрэсу і ўкараненню інавацый.

Яшчэ ў 2004 годзе магчымасць перадачы кіравання камп'ютару многім экспертам здавалася малаімавернай. Але ўжо сёння машыны з аўтапілотам раз'язджаюць па ўсёй Амерыцы, няхай пакуль і ў якасці эксперымента. Зусім нядаўна стала вядома, што Прэзідэнт Беларусі падтрымаў ідэю стварэння ўмоў для развіцця беспілотнага аўтатранспарту ў нашай краіне. Фінансавая аналітыка, кадравая работа, кулінарыя — ва ўсіх гэтых сферах ужо сёння дастаткова шырока выкарыстоўваюцца аўтаматызаваныя алгарытмы. Праграмы паспяхова ствараюць новыя праграмы — кола замкнулася. У тэорыі робат можа займацца практычна любой працай. Так званыя нейрасеткі дазваляюць камп'ютару фактычна «вучыцца», атрымліваць новую інфармацыю і адаптавацца да знешніх умоў. У інтэрнэце даўно дзейнічае некалькі сэрвісаў, пры дапамозе якіх можна ацаніць перспектыўнасць сваёй прафесіі. Дастаткова выбраць яе ў спісе, і праграма ацэніць магчымасць таго, што вас заменяць робаты ў найбліжэйшыя 20 гадоў. Адразу скажу, што вынік вельмі рэдка бывае ніжэйшым за 80 працэнтаў. Пад ударам, між іншым, і журналістыка — алгарытмы ўмеюць збіраць інфармацыю ў сецыве і «пісаць» навіны.

Але ці варта баяцца ўсеагульнага беспрацоўя і замяшчэння людзей робатамі ва ўсіх сферах? Хутчэй, не. Напрыклад, дакладна ў «зону рызыкі» не трапляюць... гуманітарыі. Яны ў недалёкай будучыні могуць стаць не проста запатрабаванымі, а крытычна неабходнымі. У гэтай думцы сыходзяцца многія эксперты — той жа Марк К'юбан сцвярджае, што ўжо праз дзесяць гадоў попыт на спецыялістаў па гуманітарных дысцыплінах будзе вышэйшым, чым на праграмістаў і інжынераў. На першае месца выйдзе крытычная ацэнка тых дадзеных, што сабралі алгарытмы, а найлепшымі выканаўцамі гэтай работы стануць філолагі і філосафы. Не трэба забывацца і пра творчасць — камп'ютары па-ранейшаму не ўмеюць пісаць вартыя ўвагі кнігі ці музыку. Так што натхнення табе,чалавек!

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Прыемны бонус*

# ЭМОЦЫІ АД УДЗЕЛУ Ў РУХУ — ТОЛЬКІ СТАНОЎЧЫЯ!

**Сацыялагічнае апытанне сярод удзельнікаў валанцёрскага руху «Добрае Сэрца», праведзенае ў канцы мінулага года Маладзёжнай лабараторыяй сацыялагічных даследаванняў пры ЦК БРСМ, паказала, што ўдзел у ім прыносіць толькі станоўчыя эмоцыі (гэта засведчылі 95 працэнтаў з 460 рэспандэнтаў).**

На думку ўдзельнікаў апытання, найбольш важная якасць для валанцёра — гэта камунікабельнасць (80 працэнтаў рэспандэнтаў). Таксама ў тройку неабходных якасцяў увайшлі самааддача (70 працэнтаў) і чуллівасць (60 працэнтаў). Больш за 60 працэнтаў рэспандэнтаў прыйшлі ў валанцёрскі рух БРСМ, ужо маючы вопыт падобнай дзейнасці. Сярод матываў далучыцца да «Добрага Сэрца» апытаныя назвалі «пачуццё спагады» (52 працэнты), «імкненне атрымаць новы погляд на людзей, жыццё, работу» (51 працэнт), «пашырэнне кола стасункаў» (40 працэнтаў), «жаданне папрацаваць бясплатна» (20 працэнтаў).

У большасці выпадкаў (84 працэнты) рэспандэнты прымалі ўдзел у сацыяльным кірунку валанцёрскага руху (работа з цяжка хворымі дзецьмі, ветэранамі, тымі, хто трапіў у цяжкую жыццёвую сітуацыю і г. д.). Цікава, што найбольш складаным кірункам 81 працэнт апытаных лічаць якраз яго, што не перашкаджае ім у найбольшай ступені прымаць удзел менавіта ў такіх сацыяльна скіраваных мерапрыемствах.

Рэспандэнты адзначылі, што вопыт валанцёрскай дзейнасці станоўча ўплывае на іх жыццё (80 працэнтаў). Гэта праяўляецца ў памяркоўнасці, дабрыні, чуласці ў адносінах да іншых людзей, упэўненасці ў сабе, паляпшэнні навыкаў стасункаў. Немалаважна, што больш за 94 працэнты апытаных плануюць працягнуць сваю дзейнасць у рамках валанцёрскага руху «Добрае Сэрца».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 03 2017 г.

Сіла — у адзінстве

# У ЧЫМ ТАЙНА «СЁМАГА ГУЛЬЦА»

## Дэвіз каманды і яе балельшчыкаў: «Мы разам: нас многа, за намі перамога!»

**Колькі гульцоў ад каманды можа знаходзіцца на полі падчас хакейнага матча? Знаўцы адкажуць: шэсць. Але на самай справе ёсць яшчэ і «сёмы гулец», які таксама вядзе каманду да перамогі, — гэта яе балельшчыкі.**

Хакейнаму клубу «Дынама-Мінск» у гэтым плане неймаверна пашанцавала: здаецца, такой моцнай і шчырай падтрымкі больш не сустрэнеш нідзе. Самыя верныя балельшчыкі становяцца членамі фан-клуба. Яны не прапускаюць ні аднаго матча, гатовыя крычаць да хрыпаты і верыць у каманду, нягледзячы ні на што.

Фан-клуб BYzone (афіцыйная назва — «Клуб балельшчыкаў хакейнага клуба «Дынама-Мінск») існуе ўжо шэсць сезонаў. Стаць часткай гэтай дружнай сям'і няцяжка: трэба толькі жаданне і членскі ўзнос. Фан-клуб дае магчымасць бясплатна наведваць усе хатнія матчы, бываць з камандай на выездах, на адкрытых трэніроўках, удзельнічаць у прэс-канферэнцыях з гульцамі. Больш таго, у балельшчыкаў ёсць свой сектар на «Мінск-Арэне». Тут самых розных людзей аб'ядноўвае адна мэта — падтрымаць каманду.

Цяжка паверыць, але яшчэ восем гадоў таму, з пачаткам шляху ў КХЛ, каманда не збірала і дзвюх тысяч чалавек у Палацы спорту. Зразумела, пра фан-клуб не было і гаворкі. Але калі балельшчыкі пачалі пастаянна хадзіць у пэўны сектар і разам са спартсменамі ездзіць на замежныя матчы, прыйшла ідэя арганізаваць усё афіцыйна.

Студэнтка III курса Мінскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа Юлія Благавешчанская ў фан-клубе ўжо чатыры гады. «З фан-сектара хакей нават выглядае па-іншаму, — прызнаецца дзяўчына. — Тут можна даць волю эмоцыям. Побач такія ж балельшчыкі, як ты. І гэта поўнае адзінства! На працягу гульні мы паспяваем і парадавацца, і пасумаваць. Часам пасля матча адчуваеш невымоўны душэўны ўздым. Аднак, калі каманда прайграла, мы не адчайваемся, а, наадварот, падтрымліваем нашых хакеістаў». З некаторымі гульцамі Юлія знаёмая асабіста: «У нас вельмі цёплыя адносіны. Хакеісты заўсёды кажуць нам дзякуй за падтрымку. Мы ствараем для іх атмасферу, а яны для нас — гульню».



Аляксандр Басько з бацькам Сяргеем Мікалаевічам.

Варта адзначыць, што ў фан-сектары ёсць некалькі «завадатараў» — тых, хто б'е ў барабан і распачынае «крычалкі». Задача астатніх балельшчыкаў — падтрымліваць «зарад». «На адным з матчаў мы так «хварэлі» за каманду, што нават барабан парвалі», — смяецца Юлія. Але ў той жа час дзяўчына лічыць, што сапраўдны балельшчык павінен быць цярплівым, часам стрыманым, бо хакей — гульня непрадказальная.

Дзесяцікласнік мінскай сярэдняй школы №30 Аляксандр Басько ўступіў у фан-клуб разам са сваім бацькам пяць гадоў таму. За ўвесь гэты час яны не прапусцілі амаль ніводнага хатняга матча! «Фан-сектар — гэта сапраўдная сям'я! — упэўнены Аляксандр. — Нас не проста аб'ядноўвае любоў да хакея, мы, нібыта сваякі, яшчэ і падобныя паміж сабой: у кожнага імянная майка з лагатыпам фан-клуба. Думаю, такую цёплую атмасферу падчас матча дапамагае ствараць тое, што балельшчыкі маюць стасункі паміж сабой і за межамі арэны. Мы вельмі сябруем і гатовыя падтрымліваць каманду, нават калі яна прайграе пяты раз запар».

Для Аляксандра самым запамінальным стаў матч у снежні 2011 года: «У канцы гульні мы выразшылі ўсім сектарам павіншаваць хакеіста Ерэ Каралахці (капітан «Дынама-Мінск» у 2011 — 2013 гг. — **Заўв. рэд.**) з Калядамі на фінскай мове. Вымавіць загадзя падрыхтаваную фразу было складана, але ў нас атрымалася!» Дарэчы, дзякуючы членству ў фан-клубе малады чалавек знаёмы не толькі з «бела-сінімі», але і з гульцамі нашай нацыянальнай зборнай: «Хакеісты паважаюць сваіх верных балельшчыкаў, яны заўсёды рады пагаварыць з імі, сфатаграфавацца, даць аўтограф».

Аліна Зыль, студэнтка I курса факультэта дашкольнай адукацыі БДПУ, упершыню прыйшла на хакей сем гадоў таму, а вось у фан-клуб уступіла нядаўна. Па словах дзяўчыны, падчас матчу яна нібыта «адключаецца» ад рэальнасці, гэта дапамагае ёй расслабіцца, адпачыць пасля цяжкага працоўнага дня. «Атмасферу неймавернай згуртаванасці балельшчыкаў я пачынаю адчуваць падчас «зорнага неба», калі ўся «Мінск-Арэна» ўключае ліхтарыкі мабільных тэлефонаў, а потым спявае гімн нашай краіны», — дзеліцца ўражаннямі Аліна.

«Вядома, калі каманда прайграе, застаецца непрыемны асадак, — прызнаецца дзяўчына. — Але ў гэтым выпадку вельмі лёгка адрозніць сапраўднага балельшчыка: ён сустракае паражэнне з годнасцю і прыйдзе на наступны матч нягледзячы ні на што».

Вочы верных фанатаў «Дынама-Мінск» быццам свецяцца пры згадванні любімай каманды. Не выпадкова беларускія балельшчыкі прызнаны аднымі з найлепшых у Еўропе. Бо з такім «сёмым гульцом» перамога хакеістам забяспечана!

**Ганна ЯЎСЕЙЧЫК,**
**студэнтка II курса Інстытута журналістыкі БДУ.**



Юлія Благавешчанская.

У ліку найлепшых

# Пуцёўка ў жыццё ад «Праметэя»

**Усё пачынаецца з мары. Праўда, адной яе — гэтай мары — мала. Патрэбны людзі, здольныя задуманае рэалізаваць. Дваццаць гадоў таму ў цяперашняй жодзінскай гімназіі №1 першае супала з другім і тут з'явіўся клуб юных ратавальнікаў-пажарных з палымянай назвай «Праметэй». Тады яшчэ не было Беларускага маладзёжнага грамадскага аб'яднання ратавальнікаў-пажарных, якое было створана ў краіне ў 2001 годзе, гэта значыць на чатыры гады пазней.**

Ініцыятарам стварэння гімназічнага клуба стала намеснік дырэктара гімназіі Галіна Антонаўна Ляпяўка (дарэчы, двойчы за сваю педагагічную дзейнасць узнагароджаная ганаровым нагрудным знакам Міністэрства па надзвычайных сітуацыях). Знайшліся і людзі, якія з натхненнем узяліся за зусім не простую справу. У першую чаргу гэта быў Андрэй Аляксандравіч Падабедаў, трэнер і выхавальнік першых пакаленняў праметэеўцаў, цікавы чалавек, выдатны спартсмен, які ў складзе каманды Рэспублікі Беларусь у верасні 2002 года на першым чэмпіянаце свету па пажарна-ратавальным спорце стаў чэмпіёнам. Нельга не згадаць і прозвішча педагога-арганізатара Вольгі Мікалаеўны Сідаркевіч, якая стала суаўтарам многіх значных дасягненняў праметэеўцаў, у тым ліку і на міжнароднай арэне.

> **«Заняткі ў клубе — гэта магчымасць загартаваць сябе як асобу, праверыць свае чалавечыя якасці».**

Адлік гісторыі клуба вядзецца з 1997 года — менавіта тады і «пасяліўся» «Праметэй» у Жодзіне. Спачатку быў толькі гурток, з якога і вырас крыху пазней поўнафарматны клуб з аднайменнай назвай. Сёння ён аб'ядноўвае гімназістаў ад 11 да 17 гадоў. Профільная група мае зменны склад удзельнікаў. Але актыў клуба, як правіла, гэта тыя, хто займаецца любімай справай па пяць—шэсць гадоў. На сённяшні дзень аб'яднанне налічвае больш як 250 удзельнікаў рознага ўзросту.

На працягу ўсяго свайго існавання «Праметэй» быў і ёсць у ліку найлепшых не толькі ў горадзе, але і ў вобласці, і ў краіне. А сакрэт поспеху заключаецца ў тым, што праметэеўцам ёсць на каго раўняцца — на сваіх папярэднікаў. Самым вядомым з іх ліку, безумоўна, з'яўляецца неаднаразовы чэмпіён і рэкардсмен свету па пажарна-ратавальным спорце, майстар спорту міжнароднага класа Уладзімір Сідарэнка, які доўгі час выступаў за каманду Беларусі, а на працягу апошніх гадоў бліскуча абараняе гонар зборнай Расіі. Напрыклад, толькі за перыяд з 2011 па 2015 год ён устанавіў дзевяць рэкордаў Расіі, два рэкорды чэмпіянату свету, пяць разоў станавіўся чэмпіёнам Расійскай Федэрацыі. А пачыналася ўсё ў Жодзіне, у гімназіі, дзе Уладзімір вучыўся з пятага класа і быў сапраўды найлепшым з ліку найлепшых за ўсю гісторыю «Праметэя». Вядомых жа ў краіне спартсменаў з ліку праметэеўцаў таксама хапала. Варта прыгадаць такіх, напрыклад, як Ігар Крэнць (рэкардсмен рэспублікі), Раман Сыраежка, Вераніка Шэвякова, Анастасія Цыбулька, Аляксей Сяргушкін, Ірына Мархель, Вольга Кругляк, Марта Кірыльчык (усе — чэмпіёны Беларусі). Гэта менавіта яны, нашы гімназісты, сталі пераможцамі першага рэспубліканскага палявога лагера «Ратавальнік» у 2005 годзе. А восень 2009-га і ў прамым, і ў пераносным сэнсе стала для «Праметэя» залатой. Каманда Рэспублікі Беларусь, аснову якой складалі жодзінскія гімназісты, перамагла на VII Міжнародным злёце клубаў ратавальнікаў-пажарных.

І мінулы год не прайшоў для клуба дарэмна — чарговая перамога ў горадзе, другое месца — на абласным палявым лагеры, плюс чацвёра яго прадстаўнікоў у складзе каманды Мінскай вобласці на XIX Рэспубліканскім злёце юных ратавальнікаў-пажарных у «Зубраняці» сталі чэмпіёнамі рэспублікі. Не выпадкова і тое, што для многіх вучняў заняткі ў клубе становяцца пляцоўкай для выбару сваёй будучай прафесіі. Уладзімір Сідарэнка, Раман Сыраежка, Арцём Авілаў, Арцём Сіліч і іншыя выпускнікі гімназіі ў многім дзякуючы менавіта «Праметэю» звязалі сваё жыццё са службай у сістэме Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

...Зборы, трэніроўкі, спаборніцтвы, пераезды, новыя гарады, новыя выпрабаванні. Зноў і зноў. «Галоўнае, — як заўважае капітан «Праметэя» Марыя Маркевіч, — каб усё гэта было недарэмным. Заняткі ў клубе — гэта магчымасць загартаваць сябе як асобу, праверыць свае чалавечыя якасці, адказаўшы на пытанні, хто ты такі, чаго варты, на што здольны, ці можаш быць сапраўдным сябрам».

